**Л. С. Скрабіна**

# ДАКУМЕНТЫ АСАБІСТАГА АРХІВА В. З. КАРЖА ЯК КРЫНІЦА ДАСЛЕДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў БЕЛАРУСІ (чэрвень 1941 г. – верасень 1942 г.)

У апошнія гады «партызанская праблема» як частка гісторыі Вялікай Айчыйннай вайны ўсё часцей становіцца прадметам не толькі навуковага, але і грамадскага абмеркавання. Ёй прысвечана вялікая колькасць навуковых і навукова-папулярных публікацый. Аднак, як слушна сцвярджае беларускі даследчык А. М. Літвін, «далеко не все факты и события, особенно относящиеся к наиболее трудному периоду лета-осени-зимы 1941–1942 гг., нашли исчерпывающее отражение в отечественной историографии» [1, с. 3].

У 1998 г. былі выдадзены партызанскі дзённік і ўспаміны легендарнага арганізатара партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, генерала Чырвонай арміі, героя Савецкага Саюза В.З. Каржа [2]. Яшчэ раней, у 1994 г. у Беларускім гістарычным часопісе была надрукавана дакладная запіска В. З. Каржа на імя П. К. Панамарэнкі аб праведзенай рабоце ў тыле ворага за перыяд з чэрвеня 1941 г. па красавік 1942 г. [3]. Унікальныя ваенна-гістарычныя матэрыялы адлюстроўваюць падзеі першага, вельмі складанага перыяду партызанскага руху на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: чэрвень 1941 – верасень 1942 г. Таму аўтар абмяжоўвае змест артыкула менавіта вышэй названымі храналагічнымі рамкамі. Гэтыя арыгінальныя матэрыялы з`яўляюцца важнай крыніцай для аб`ектыўнага і грунтоўнага даследвання станаўлення і развіцця партызанскага руху на Беларусі.

Вядома, што ў 30-я гады ў рэспубліцы шмат рабілася для разгортвання партызанскай барацьбы ў выпадку магчымай вайны. У спецыяльныя тайнікі было закладзена некалькі дзясяткаў тысяч адзінак стралковай зброі, у тым ліку кулямётаў. А галоўнае – спецыяльную падрыхтоўку праходзілі кадры будучых арганізатараў і камандзіраў партызанскіх атрадаў. Сярод іх быў і Васіль Захаравіч Корж.

Аднак пасля вядомых перадваенных судзебных працэсаў над камандзірамі, што належалі да вышэйшага каманднага складу Чырвонай арміі, выкрыцця «змоў» у Чырвонай арміі гэта работа была спынена, тайнікі са зброяй ліквідаваны, як і падрыхтаваныя для разгортвання партызанскай барацьбы кадры. Уцалелі з усіх пасля чыстак толькі тры чалавекі: В. З. Корж, К. П. Арлоўскі і С. А. Ваўпшасаў [4, с. 19]. Уцалелі яны таму, што ў разгар рэпрэсій знаходзіліся ў Іспаніі.

Падрыхтоўку да партызанскай вайны на тэрыторыі СССР партыйнае кіраўніцтва пачало разглядаць як паражэнства. Савецкая дактрына не прадугледжвала магчымасці вядзення партызанскай барацьбы на сваёй тэрыторыі. Між тым, вельмі хутка, пасля паражэнняў Чырвонай арміі ў прыгранічных баях летам 1941 г., савецкае кіраўніцтва вымушана было зрабіць стаўку на актывізацыю супраціўлення ў тыле ворага. Ужо праз тыдзень пасля пачатку нямецкага наступлення дырэктыва СНК СССР і ЦК УКП(б) патрабавала, акрамя знішчэння ці эвакуацыі з тэрыторыяў, якім пагражала акупацыя, уся-

го, што магло б пайсці на карысць ворагу, яшчэ і ўтварэння дыверсійных груп і партызанскіх атрадаў, што мусілі стварыць невыносныя ўмовы для ворага і яго памагатых. Пры гэтым галоўнымі задачамі такіх груп і атрадаў было знішчэнне варожых сіл, пашкоджанне сістэмы іх забеспячэння і зрыў усіх аперацый ворага [1, с. 23]. Пастанова ЦК УКП(б) «Об организации борьбы в тылу германских войск» ад 18 ліпеня 1941 г. яшчэ раз пацвердзіла згаданую дырэктыву і акрэсліла, што гэтай барацьбе належыць надаць «самый широкий размах и боевую активность». Мясцовым партыйным і савецкім кіраўнікам прадпісвалася адразу ж узяцца за арганізацыю супраціву, «лично возглавить это дело» [1, с. 41].

У Беларусі пачатак арганізацыі партызанскай і падпольнай барацьбы звязаны з прыняццем дырэктывы ЦК КП(б)Б № 1 ад 30 чэрвеня 1941 г. аб пераходзе на падпольную работу партарганізацый раёнаў, захопленых ворагам, і дырэктывы ЦК КП(б) Б № 2 ад 1 ліпеня 1941 г. партыйным, савецкім і камсамольскім арганізацыям па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага. Відавочна, што пасля пачатку нямецкай ваеннай кампаніі савецкае кіраўніцтва пачало надаваць належнае значэнне разгортванню партызанскай вайны, пры гэтым, як падаецца, меркавалася, што супраціў па магчымасці мусіць быць арганізаваны зверху.

Перад Айчыннай вайной В.З. Корж працаваў у Пінскім абкаме партыі загадчыкам фінансавага сектара. Аб тым, што пачалася вайна, у Пінску стала вядома толькі апоўдні 22 чэрвеня 1941 г. В. З. Корж, як і іншыя работнікі, быў тэрмінова выкліканы ў абкам. У сваіх запісах Васіль Захаравіч першы дзень вайны апісвае так: «…Приехала вдруг за мной обкомовская машина. Шофер коротко сказал: сегодня на рассвете разбомбили Жабинковский аэродром. Всех работников срочно вызывают в обком. Я мгновенно забыл, что работаю заведующим финансовым сектором Пинского обкома партии. У меня сразу сработала мысль: Что делать? Надо организовывать партизанские отряды и поднимать народ на борьбу…» [2, с.191].

Не чакаючы «ўказанняў зверху», Пінскі абкам партыі ў першы дзень вайны задаволіў хадайніцтва В. З. Каржа аб стварэнні партызанскіх атрадаў і дыверсійных груп у вобласці. Аб гэтым сведчыць баявы летапіс партызанскага атрада Камарова (псеўданім В. З. Каржа) з першых дзён яго існавання. «После того, как А. М. Минченко [першы сакратар Пінскага абкама партыі. – *Л. С.*] закончил отдавать распоряжения, я попросил их обоих [у кабінеце Мінчанкі знаходзіўся другі сакратар абкама П. Г. Шапавалаў. – *Л. С.*] выслушать мои намерения и планы по организации партизанских отрядов. У них получилась маленькая заминка. Я это видел. Ведь не было сверху на этот счет никаких указаний. Но они очень правильно поступили: взяли на свой риск организацию партизанского отряда в тот же день» [2, с. 191–192]. Па тэлефоне было дадзена распараджэнне сакратару Пінскага гаркама партыі Гомельштэйну дапамагчы Каржу В. З. арганізаваць партызанскі атрад з камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных.

«Так состоялось решение Пинского обкома об организации партизанского отряда в первый день войны и утверждении меня его командиром», – пісаў пазней В. З. Корж [2, с. 192]. Атрад быў арганізаваны з 60 чалавек, у яго

ўваходзіла некалькі старых партызанаў, камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных жыхароў г. Пінска. На ўзбраенні атрада знаходзіліся толькі вінтоўкі і некалькі гранат. «Вооружиться пулеметами и автоматами нам не удалось, поскольку нам не оказали в этом никакого содействия ни военные части, которые там находились, ни НКВД» [3, с. 15].

Корж адкрыў першую старонку трохгадовай гісторыі партызанскага руху ў Беларусі. Як бачым, яго не давялося закідваць у тыл ворага з Цэнтра. Ён быў з кагорты беларускіх партызан першага часу. Першае баявое «хрышчэнне» атрад атрымаў 28 чэрвеня 1941 г., калі на Лагішынскім тракце група партызан уступіла ў адкрыты бой з падраздзяленнем немцаў, што рухаліся па тракце. У выніку гэтай першай сур`ёзнай схваткі з праціўнікам былі знішчаны дзве нямецкія танкеткі і іх экіпажы, узяты ў палон два афіцэры і першы трафей – танкавы кулямёт. Гэты бой быў першым партызанскім боем на беларускай зямлі і, магчыма, першай партызанскай акцыяй Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.

У першы момант у дзеяннях атрада Каржа відавочна пераважала тактыка наладжавання засад на шляхах руху ворага, каб перашкаджаць прасоўванню нямецкай арміі. Потым, калі колькасна вырастуць атрады, партызанам будуць па сілах больш маштабныя аперацыі – здзяйсняць рэйды, граміць варожыя камунікацыі і гарнізоны. У дакументах асабістага архіва В. З. Каржа ўтрымліваецца шмат фактаў, якія сведчаць аб гераічнай барацьбе партызан атрада Камарова як на першым этапе вайны, так і пазней. Так, 4 ліпеня 1941 г. камароўцы вельмі ўдала арганізавалі засаду ў раёне былога маёнтка Заполье, што ў трох кіламетрах ад Пінска. «В 12 часов дня 4 июля кавалерия противника в количестве двух эскадронов показалась из леса и двинулась на Пинск. Третья группа, в которой в это время находился и я, на близком расстоянии в упор начала расстреливать фашистскую кавалерию, завязался бой…, фашисты все спешились и начали вести сильный пулеметный огонь. В этом бою мы потеряли одного командира группы т. Корнилова и три товарища были ранены. Фашистов … было убито 20 человек. После этого боя мы отступили по ржи в город» [3, с.15]. Было шмат і іншых баёў і засад. Аднак вялікіх баёў камароўцы ў той час, зразумела, не маглі весці, таму што для гэтага ў атрада не было дастаткова зброі і боепрыпасаў.

4 ліпеня 1941 г. фашысты ўварваліся ў Пінск, а 8 ліпеня акупіравалі ўсю вобласць.

Не ўсе партызанскія атрады, якія былі створаны ў 1941 г., працягвалі барацьбу. Прычын таму некалькі. Па-першае, нямецкія карныя акцыі і звярыны тэрор акупацыйных улад прыводзілі да значных страт партызан. Па-другое, непадрыхтаваныя, дрэнна ўзброеныя, не маючы сувязі, дастаткова медыкаментаў, вопраткі, харчавання, партызаны часта гінулі, не наносячы ворагу значных страт. Асабліва ўскладнілася партызанская барацьба суровай зімой 1941–1942 гг.

Праз дзесяцігоддзі баец-камаровец, а пазней генерал-маёр КДБ Э. Б. Нордман успамінаў: «К ноябрю из 17 партизанских формирований, созданных в Столине в начале июля, продолжал действовать только отряд Комарова, то есть наш... В течение июля – сентября они были или разбиты, или, израсходо-

вав боеприпасы и продовольствие, двинулись к линии фронта. Сказалось отсутствие подготовленных баз, связей, постоянного контакта с Большой землей, а больше всего – опыта ведения партизанской борьбы и владеющих таким опытом командиров» [4, с. 53–54].

Аднак не ўсё проста было і ў атрадзе нават такога вопытнага камандзіра, як В. З. Корж. У сваёй дакладной запісцы ён піша: «8 июля 1941 г. подошел ко мне боец Мезевич и с ним еще 3 человека, которые заявили, что у них слабое здоровье, они не выдержат в тылу, лучше пойдут догонять своих и воевать в Красной Армии. Я решил их отпустить, т. к. действительно видел в них малоспособных бойцов в тылу врага» [3, с. 16].

Здаралася, што і мясцовыя партыйныя, савецкія функцыянеры, работнікі НКУС і НКДБ, якія былі прызначаны кіраваць партызанскім рухам, імкнуліся перайсці праз лінію фронта і ўліцца ў шэрагі дзеючай Чырвонай арміі. У гэтым пераконвае з ўсёй відавочнасцю аналіз дакументаў асабістага архіва В. З. Каржа. Звернемся ў гэтай сувязі да дакладной запіскі В. З. Каржа. У прыватнасці, у ёй адзначаецца: «25 июля 1941 года мой заместитель Березин поставил вопрос, чтобы уходить за фронт, к нему подобралось еще человек 18 нытиков, маловеров, испугавшихся трудностей. Мой запрет и доказательства, что этого нельзя делать, оказались бессильными… 26 июля 1941 года 19 человек во главе с Березиным ушли за фронт, остались более честные и преданные патриоты нашей родины» [3, с. 17]. 29 ліпеня В.З. Корж пасылае 4 чалавекі з ліку партызан за лінію фронта, каб яны звязаліся з ЦК КП(б), паведамілі аб паводзінах Бярэзіна і іншых камуністаў, пакінутых для арганізацыі партызанскіх атрадаў, якія пайшлі з ім.

Прыкладна ў той жа час камароўцы сустрэліся з атрадам, якім камандаваў былы начальнік Ленінскага раённага аддзела НКУС Сахараў. Корж і Сахараў абмеркавалі план сумесных дзеянняў. Але ў хуткім часе стала зразумела, што Сахараў адносіцца крайне скептычна да самой магчымасці актыўных дзеянняў у тыле ворага. Праз пару дзён высветлілася, што «партизанский отряд из Ленинского районного актива, организованный обкомом для борьбы с немцами в их тылу, Сахаров спешно повел на восток, за линию фронта. И этот их уход больше походил на бегство» [5, с. 247].

Да верасня 1941 г. атрад Камарова дзейнічаў у Жыткавіцкім раёне, а потым, як піша В. З. Корж, «жизнь и борьба заставили нас перейти в Старобинский район. Этот переход в Старобинский район нашего партизанского отряда вызывался тактикой партизанской борьбы». Дело в том, что в этом районе еще от гражданской войны остались партизанские кадры. Их не уничтожили во время произвола Сталина. Перш за ўсё, В. З. Корж называе старога партызана, былога чырвонаармейца І. Т. Севасцьянчыка, І. Бараноўца, С. Ф.Сеўрука [2, с. 197–198].

У сярэдзіне верасня атрад сустрэўся з групай партызан Старобінскага раёна ў складзе 35 чалавек, камандзірам якой быў А. З. Пратасеня. Шмат хто з іх стаў прасіцца перайсці ў атрад Камарова, гаварылі, «что у них нет командира, т. е. очень много командиров и неизвестно, кого слушать». Васіль

Захаравіч пагутарыў з байцамі і параіў аздаравіць кіраўніцтва атрада. Адначасова ён растлумачыў, што браць іх ў свой атрад будзе горш для агульнай справы, таму што, чым больш атрадаў дзейнічае ў розных напрамках, тым лепш для ўсіх. Гэта пашырае і ўдзесяцярае магчымасці партызан [3, с. 7].

І на самой справе, што кінулася ў вочы Каржу: камандзір даваў распараджэнне байцам, а былы старшыня Старобінскага райвыканкама (В. Ц. Меркуль. – *Л. С.*) адмяняе яго без усялякага на гэта права. А партызаны ведалі, што ён не камандзір і нават не камісар атрада, а байцом яго назваць таксама нельга было, таму што распараджэнняў камандзіра ён не выконваў. Корж разумеў, што камандзір у атрадзе зусім нявопытны, не валодае ўменнем кіраваць. Напачатку ён правёў размову з парторгам атрада М. І. Бандароўцам, якому прама сказаў: «Нельзя подрывать авторитет командира: или вы ему помогайте руководить, или поставьте другого товарища» [3, с. 8].

Гэтае пытанне было вынесена на партыйны сход. Камандзірам быў выбраны М. І. Бандаровец. З ім жа Васіль Захаравіч адразу дамовіўся правесці рэйд кіламетраў на 300 па тэрыторыі Мінскай вобласці. Для гэтага вылучылі 60 лепшых байцоў з двух атрадаў. Зазначым, што адной з галоўных задач рэйду было пашырэнне партызанскага руху ва ўсіх раёнах, дзе намячалася ажыццявіць гэтую аперацыю.

2 кастрычніка 1941 г. партызаны-камароўцы сустрэліся з групай партызан атрада М. І. Бандароўца і пайшлі рэйдам адразу ў Краснаслабодскі раён. Важнейшым вынікам паходу сталі, як падкрэслівае В. З. Корж, сустрэчы з насельніцтвам, сувязі з людзьмі, «через которых можно было втягивать народ в партизанское движение… Само присутствие партизанского отряда в районе подняло дух населения. Население из нас 60 человек делало 600 человек. Для нас это было полезно» [3, с. 8].

Аднак ажыццявіць задуманы план не ўдалося па той прычыне, што сярод партызан знайшліся «хныцікі і малаверы», якіх страшыла наступаючая зіма. Адны прапаноўвалі разыйсціся па дамах, па знаёмых, родзічах. Іншыя – рухацца на ўсход, а то і зусім за лінію фронта. «Самым влиятельным нытиком был В. Т. Меркуль» [3, с. 8]. У такой сітуацыі аб`яднаны атрад вымушаны быў вярнуцца назад у старыя лагеры.

Між тым спрэчкі ў атрадзе не сціхалі. 14 кастрычніка адбыўся партыйны сход атрада, які быў выкліканы паводзінамі некаторых партызан, якія вырашылі ісці за лінію фронта. «На партсобрании эти товарищи хотели заставить меня, – піша В. З. Корж, – вести весь отряд за фронт. На собрании отряда я наотрез отказался от этого неправильного предложения некоторых товарищей и сказал, что за состояние отряда в зимнее время я отвечаю, заявляю, что будем работать зимой не меньше, чем летом. Но по настоянию 9 человек, из них большинство члены партии, пришлось выдать справки о пребывании их в отряде и отпустить за фронт» [3, с. 8].

21 ліпеня 1941 г. быў створаны Мінскі падпольны абкам КП(б)Б, на чале якога стаў былы сакратар абкама В. І. Казлоў. Галоўнай задачай абкама з`яўлялася разгортванне партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай, а з краса-

віка 1942 г. і Палескай абласцей. Таксама ў межах гэтых тэрыторый абкам павінен быў ажыццяўляць ускладзеную на яго задачу кіраўніцтва падпольнай і партызанскай барацьбой. В. З. Корж надае гэтаму пытанню асаблівую ўвагу, прычым выказвае ўласнае меркаванне адносна сітуацыі, якая складвалася ў першыя дні і месяцы вайны. У яго дакладной запісцы пакінуты наступныя радкі: «При встрече с т. Козловым [1-й сакратар Мінскага падпольнага абкама КП(б)Б. – *Л.С.*] я предложил пройти группой партизан севернее Слуцка, посмотреть, что есть в Воробьёвских лесах, в Греском, Копыльском районах и выйти в Краснослободский район, а потом в Старобинский район с задачей – произвести по дороге несколько операций по уничтожению полиции и немцев и подымать партизанское движение во всех районах… Расширить район действия партизан в самое трудное время, как зима и т. д. тов. Козлов было согласился, а потом стал категорически не советовать мне и Бондаровцу» [3, с. 8].

З поўным правам В. З. Корж заўважае, што праблема так званай «сямёркі» (група работнікаў Мінскага падпольнага АК КП(б)Б) заключалася ў тым, што яны цалкам разлічвалі на дырэктыўныя ўказанні з Масквы, знаходзіліся ў глухім лесе, не маючы ніякай сувязі з партызанамі. Яшчэ пры першай сустрэчы (восень 1941 г. – *Л.С.*) В. З. Корж гаварыў В. Казлову: «…тебе не находиться в отряде нельзя, и вы делаете большую глупость, что вы скрываетесь от отряда, т. е. по вашему "конспирируетесь", тебе надо стать комиссаром отряда и раздувать дальше партизанские дела… Он моим советом пренебрег, посчитал, что он "большой" человек и ему указывать и советовать нельзя» [3, с. 10]. Больш за тое, як далей успамінае В. З. Корж, калі камароўцы наладзілі цесную сувязь яшчэ з адным атрадам, сталі праводзіць сумесныя баявыя дзеянні, кантраляваць больш вёсак, яны аддаляюцца ад партызан на 25 кіламетраў. Пэўнае ўдакладненне становішча, звязанага з паводзінамі партыйнага кіраўніцтва, даюць і іншыя дакументальна зафіксаваныя факты. Так, у момант знаходжання партызанскага атрада Камарова (зіма 1941 г.) у Любанскім раёне, В. З. Корж, ведаючы аб знаходжанні тут «сямёркі», як мага хутчэй спяшаўся звязацца з В. І. Казловым. Аднак «Василий Иванович Козлов, Мачульский и другие, как они тогда назывались, – "семёркой", продолжали "сидеть" где-то в лесу…, т.е. прятаться от всех, от жителей и от партизан, никакой работы не проводили…. Отряды знали, что есть такая "семёрка", и знали, что это партийные товарищи. Было страшно обидно за неправильное поведение этой "семёрки", которую ничего не интересовало, а только лишь спасали свою шкуру и отсиживались в тылу…» [3, с. 13].

У гэтай сувязі неабходна адзначыць крайне негатыўнае стаўленне Васіля Захаравіча да падобных паводзін прадстаўнікоў партыйна-савецкай наменклатуры, якіх называе трусамі і паразітамі. У сваім дзённіку 23.08.1941 г. ён запісвае аб тым, як яму хочацца знішчаць гітлераўцаў, якіх называе «людаедамі, паразітамі, парушальнікамі мірнай працы ўсяго чалавецтва». Але не меньшае абурэнне выклікалі ў яго паводзіны прадстаўнікоў партыі, якія «годами сидели на ответственных постах, губили живое дело, называли

себя “героями”, а сейчас пошли “в кусты”. А если не в кусты, то блытаются по нашим тылам и мешают честным людям вести Отечественную войну с фашизмом. Этих тоже нужно уничтожать, а в крайнем случае, никогда не допускать даже на самые малые должности, а послать на физическую черновую работу и брать в жесткую дисциплину. Это те паразиты, через которых мы сейчас пока потерпим поражение» [2, с. 203].

Згодна з рашэннем кіраўніцтва атрада была паслана група з падводамі для таго, каб прапанаваць кіраўніцтву Мінскага абкама выехаць у в. Загалле, дзе знаходзіліся два атрады. Калі яны прыехалі ў штаб, які размяшчаўся ў гэтай вёсцы, то сапраўды знешні выгляд іх быў падобны на «ту “божью семёрку”», про которую в отрядах говорили, все были небриты, бороды были похожи на апостольские, ребята смеялись, брили и приводили их в порядок, нашли им квартиру, расположили и с того момента они начали общаться с партизанами. Это был уже февраль месяц 1942 г. [3, с. 13].

Крыху пазней В. З. Корж быў уведзены ў склад гэтай «сямёркі» ў якасці ваеннага кіраўніка ўсімі атрадамі, з якімі была наладжана сувязь. Зазначым, што ў той час атрад Камарова трымаў сувязь з пяццю атрадамі.

Важным момантам тагачаснага этапу пошукаў новых тактычных дзеянняў можна лічыць тое, што ў студзені 1942 г. В. З. Корж спланаваў першы, пасапраўднаму вялікі партызанскі рэйд сіламі некалькіх атрадаў. Рэйд пачаўся 19 лютага і быў разлічаны на месяц. Камандаваў усімі атрадамі В. З. Корж, нягледзячы на тое, што В. І. Казлоў з групай абкама таксама ехаў разам з партызанамі. На працягу ўсяго рэйду «сямёрка» «ни в какие оперативные дела не вмешивалась» [3, с. 14]. Справа ў тым, што яшчэ да пачатку аперацыі В. Казлоў вырашыў, што яе павінен узначаліць менавіта В. З. Корж як вопытны камандзір. Такі выбар можна разглядаць як ухіленне 1-га сакратара ад адказнасці, улічваючы яго «агульнае кіраўніцтва», у выпадку магчымых няўдач.

21 лютага сіламі чатырох партызанскіх атрадаў была здзейснена першая сумесная аперацыя, у выніку якой была разгромлена Кузміцкая воласць і паліцэйскі ўчастак [2, с. 216]. Вынік саннага рэйду можна ацаніць як значны. У сваёй справаздачы В. З. Корж канстатуе: «За этот рейд мы сделали много полезного, разгромили несколько полицейских участков, укрепили веру в народе в победу Красной Армии, пронеслась очень большая легенда, что нас очень много, что это регулярная воинская часть. Все это в нашу пользу» [3, с. 14].

Між тым план рэйду не быў канчаткова выкананы па той жа прычыне, што і восенню 1941 г. Некаторыя кіраўнікі атрадаў сталі вагацца, іх пужала небяспека невядомай мясцовасці. Яны не жадалі рызыкаваць сваім жыццём, таму настойвалі на вяртанні ў свае месцы. Асабліва пачала непакоіцца аб вяртанні назад нічым сябе не праявіўшая ў баявых справах «святая сямёрка» В. І. Казлова. Аднак самым уплывовым «хныцікам» быў усё той жа В. Ц. Меркуль. Замест таго, каб дапамагчы В. З. Каржу як камандзіру выканаць да канца

план рэйду, адны з іх, як адзначаецца ў дакладной запісцы, «начали ставить палки в колеса, другие заняли нейтральную позицию, и мне пришлось волей-неволей согласиться на этот отход» [3, с. 14].

Шматаспектная праблема адносін партызан да мясцовага насельніцтва заслугоўвае асобнай увагі. Дакументальныя матэрыялы дазваляюць з большай аб`ектыўнасцю паказаць іх сапраўдныя ўзаемаадносіны. Так, у сваёй справаздачы В. З. Корж паведамляў, што з дапамогай стараст, паліцэйскіх і «ўсякай сволачы» немцы пасеялі такі страх у насельніцтва, што яно «боялось не только встретиться с партизанами, а даже знать что-нибудь о партизанах». З-за гэтага «жизнь партизан становилась трудной, не было где доставать продукты. Население боялось кормить партизан», і тыя хварэлі [3, с. 17]. Яшчэ праз месяц В. З. Корж заўважаў, як паліцыя «росла по деревням, множилась и распространяла свое влияние на население. Население легко поддавалось полицейскому влиянию потому, что ничего не знало о фронте…» [3, с. 18]. У святле гэтай ацэнкі неабходна прыняць пад увагу рэпрэсіўныя акцыі савецкай улады супраць вялікай масы людзей, без уліку якіх немагчыма зразумець адносіны адчужэння і нават варожасці, якія не абяцалі разгортвання «ўсенароднай барацьбы ў абарону гэтай улады. Адметным у плане паказу тых падзей можна лічыць запіс, які пакінуў Васіль Захаравіч у сваім дзённіку 7.09.41 г., у якім распавядае аб тым, што, знаходзячыся ў дзвюх вёсках (Мілеў і Залючыцы), яны не знайшлі ні ў адной хаце мужчын. Усіх даўно забралі, некаторых на 3–5 гадоў за тое, што «злые люди наговорили, а товарищи [прадстаўнікі савецкіх органаў. – *Л. С.*] не разобрались и взяли. И я пришел к убеждению, – працягвае ён, – что столько противников советской власти не было и не могло быть, а иначе она не держалась бы и не имела бы таких успехов, какие имела». І далей Васіль Захаравіч выказвае не толькі сваё меркаванне, але і разуменне, якое склалася ў народзе, таго, што тыя, хто вырашаў лёс чалавека і лёс цэлай сям`і, адштурхоўвалі гэты народ ад савецкай улады [2, с. 206]. У гэтым запісе можна прачытаць і аб іншым факце, які дапамагае таксама ўбачыць рэальную карціну трагічных падзей, звязаных з рэпрэсіямі 30-х гадоў. Так, калі камароўцы знаходзіліся на хутары (тэрыторыя былой Заходняй Беларусі), В. З. Корж запытаў у старога мужчыны: «как живется, дедушка? Эй, говорит, детки плохо. При польской власти еще кое-как жили, а при этих большевиках никакой жизни нет. Вот я был у своих за рекой, там, где были большевики, там же, говорит, не осталось ни одного мужика, около границы всех побили. Разве это власть? Так, говорит, робит сейчас Гитлер, расстреливает людей ни за что. Это, говорит, не власть, если она уничтожает ни за что своих людей» [2, с. 207].

Правільным узаемаадносінам з насельніцтвам В. З. Корж надаваў асаблівую ўвагу. Ён лічыў гэта адным з асноў для далейшага развіцця партызанскага руху. У сваім дзённіку, успамінах і справаздачы ён імкнуўся пісаць аб тым, як рэальна складваліся адносіны паміж партызанамі і насельніцтвам. Гэтыя дакументы ўтрымліваюць шмат фактычных звестак аб шчыльных кантактах з насельніцтвам.

Ва ўмовах адсутнасці запасаў харчавання правядзенне гаспадарчых аперацый па іх нарыхтоўцы стала практычна асновай эфектыўнай барацьбы партызан у тыле ворага. Аб гэтым 12.08.41 г. піша В. З. Корж: «Сейчас буду посылать людей в разные стороны за кое-каким продуктом. Самое тяжелое для партизан – это питание. Было бы питание, работы было бы больше на 75 %» [2, с. 202]. Пры гэтым камароўцы «никогда и крошки хлеба не брали насильно, как ни тяжко приходилось. Исключение – только дома изменников, предателей, и крестьяне хорошо помнили это… Новичкам, приходившим в отряд, строго внушали правила морального кодекса партизан: мало быть смелым в бою, надо быть другом каждого крестьянина, его защитником, его совестью» [5, с. 322–323]. Праўда, трэба прыняць пад увагу, што такія прыстойныя паводзіны партызан у паўсядзённым жыцці не былі характэрнымі для ўсіх чальцоў асобных атрадаў. І В. З. Корж не замоўчвае негатыўныя праблемы, звязаныя з адсутнасцю дысцыпліны, п`янствам, рабаўніцтвам насельніцтва. «В ряде наших отрядов народ разбалован, процветало пьянство, мародерство, неправильные взаимоотношения с населением, мы в своем отряде, особенно руководящий состав, всё это видели и страшно переживали, ведь это наше общее дело, государственное дело…» [3, с. 13].

Далейшага разгляду патрабуе яшчэ інфармацыйна-прапагандысцкая работа сярод мясцовага насельніцтва, якую праводзілі камароўцы. Вядома, што прапагандысцкі апарат акупантаў усімі сродкамі імкнуўся «вылечыць народ ад бальшавізму», а таксама дыскрэдытаваць партызанскі рух, знішчыць веру людзей у перамогу Чырвонай арміі, звярнуць іх са шляху актыўнай барацьбы супраць захопнікаў. Нягледзячы на тое, што партызаны маглі быць на акупаваных тэрыторыях пэўным цяжарам для мясцовага насельніцтва, але яны прапаноўвалі альтэрнатыву. Праз уласную прысутнасць яны закладвалі і ўзмацнялі сумнеў у перамозе немцаў і ўяўлялі з сябе канкурэнцыю для акупантаў як з палітычнага, так з інфармацыйнага гледзішча.

Да прапаганды сярод насельніцтва В. З. Корж ставіўся вельмі сур’ёзна. Ён ведаў, што пасля нападу немцаў мясцовыя памагатыя (старасты, бургамістры) імкнуліся запалохаць мясцовае насельніцтва, стварыць пачуццё жаху ад магчымай помсты з боку немцаў за сувязь з партызанамі. Таму з насельніцтвам, як падкрэслівае В. З. Корж, «надо было работать очень тонко, правильно ему всё разъяснять и постепенно втягивать в партизанскую борьбу против немцев. Приходилось очень часто даже не брать у крестьян продуктов, голодать, добиваться симпатии у населения, опрокидывая этим самым фашистскую агитацию, в которой оккупанты называли нас на каждом шагу “бандитами”, заявляли, что мы лишь грабим население и т. д.» [3, с. 17].

Сярод шматлікіх праблем развіцця партызанскага руху, асабліва на першым этапе вайны, якія раскрываюцца ў дакументах В. З. Каржа, нельга не згадаць пра забеспячэнне партызанаў зброяй і боепрыпасамі. Адразу ж звернем увагу на тое, што гэтая праблема праходзіць «чырвонай ніткай» праз

дзённікавыя запісы В. З. Каржа і іншыя яго дакументы. Для эфектыўнага змагання не хапала зброі, боепрыпасаў, і ў гэтым В.З. Корж бачыў адну з перашкод для магчымага распаўсюджвання партызанскай вайны.

Вядома, што напачатку вайны партызаны вымушаны былі самі сябе забяспечваць зброяй за кошт нямецкіх трафеяў. Аб гэтым, у прыватнасці, у сваіх запісах В. З. Корж адзначае: «Предстояло подбирать в отряд новых людей, добывать оружие у самого врага…» [5, с. 244]. У справаздачы на імя П. К. Панамарэнкі можна знайсці шмат прыкладаў такога кшталту. Так, 5 жніўня 1941 г. група партызан-камароўцаў на тракце Леніна – Жыткавічы напала на машыну, якая ішла на фронт. Было знішчана 15 немцаў, з іх 5 афіцэраў, забрана 10 вінтовак, 5 пісталетаў. 21 жніўня ў выніку такой жа аперацыі была знішчана нямецкая разведка. Трафеі склалі: 2 аўтаматы, 2 пісталеты, 2 гранаты, бінокаль, 300 патронаў да аўтаматаў [3, с. 17–18].

Аналіз дакументальных матэрыялаў паказвае, што пытанне забеспячэння партызанаў зброяй і боепрыпасамі засталося складаным і ў 1942 годзе. У якасці прыкладу прывядзём некалькі вытрымак з дзённіка В. З. Каржа: «10/VII. 42 г. … было бы оружие, можно было половину этих людей [з 200 чал., якія былі запісаны ў паліцыю. – *Л. С.*] забрать в отряд» [2, с. 221]; «1/VIII.42 г. … 27 человек во главе с тов. Мурашкой направлены для поиска оружия в другом районе»; «2/VIII.42 г. во главе с ком. т. Бондаревым направлена группа в составе 8 человек за оружием…» [2, с. 223].

Неаднаразова і сам Васіль Захаравіч сумесна з сваімі камароўцамі адпраўляўся на пошукі былых тайнікоў з назапашанай зброяй і харчаваннем. Аднак кожны раз ён вяртаўся ні з чым. Усё было тупа і бяздумна ліквідавана яшчэ чатыры гады таму.

Адной з галоўных задач, якія стаялі перад партызанамі Беларусі, у тым ліку і атрада Камарова, быў падрыў забеспячэння праціўніка боепрыпасамі, зброяй і тэхнікай. Закранаючы гэтую праблему, неабходна адзначыць, што толькі з вясны – лета 1942 г. партызаны-камароўцы сталі надаваць важнае значэнне дыверсійнай рабоце на чыгуначных камунікацыях. Спачатку даволі часта выкарыстоўваўся такі спосаб знішчэння варожых эшалонаў, як развінчванне рэек. Гэта тлумачылася дэфіцытам выбухоўвых рэчываў, якія партызаны стараліся берагчы і выкарыстоўваць толькі тады, калі вырашыць пастаўленую баявую задачу іншымі спосабамі было немагчыма. Аб адной з такіх аперацый В. З. Корж запісаў у сваім дзённіку: «8/VI.42 г. произведено крушение воинского эшелона, шедшего на фронт между ст. Житковичи и зап. ж. д., ручным способом – развинчивание рельс и расшивка путей. Уничтожено, со слов населения, бывшего на месте крушения, 200–300 немецких солдат и офицеров, много раненых (по уточненным данным, уничтожено более 600 солдат)» [2, с. 218]. За гэтую аперацыю партызан Іван Некрашэвіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Дзякуючы дзейнасці камароўцаў удалося нанесці значную шкоду чыгуначнаму транспарту і рухомаму складу акупантаў.

Сведчаннем таму з`яўляюцца дзённікавыя запісы Васіля Захаравіча ад 24/VI. 42 г.; 30/VI.42 г.; 3/VII.42 г.; 15/VII.42 г.; 16/VII.42 г.; 16/VIII. 42 г.; 25/VIII.42 г.; 7/IX.42 г. [2, с. 218, 220, 221, 222, 224, 226, 228]. Вось адзін з іх: «Группа тов. Спокойного, которая направилась на работу 27/VIII.42 г., вернулась 2/IX вечером. За это время сделано следующее: с 4 на 5 сентября 42 г. группа действовала в трех направлениях на ж.д. Лунинец–Барановичи и Лунинец–Пинск. Первая в количестве 15 человек во главе с т. Некрашевичем Иваном подорвала поезд, следовавший на фронт с воинскими грузами и техникой. Вторая группа во главе с тов. Ершовым и десантником Николаем подорвала воинский эшелон, шедший с фронта. Третья группа во главе с т. Спокойным пустила под откос воинский эшелон, идущий на фронт между ст. Лунинец и ст. Дятловичи» [2, с. 228].

Зразумела, дыверсіі ў гэты перыяд маглі б ажыццяўляцца яшчэ больш інтэнсіўна, але не хапала, як ужо адзначалася, выбуховых рэчываў. Васіль Захаравіч даражыў літаральна кожным грамам траціла, імкнучыся найбольш эфектыўна выкарыстоўваць яго на камунікацыях ворага. Таму не мог і не жадаў ён браць тады на сябе нейкія «ўдарныя сацабавязацельствы» па знішчэнні «штук рэек», якія спускаліся «зверху» [5, с. 351].

Напрыканцы звернем увагу на праблему кіраўніцтва па каардынацыі дзейнасці партызанскіх атрадаў і груп. Аналіз зместу дакументальных матэрыялаў паказвае, што ўжо ў канцы 1941 г. атрад Каржа ўзаемадзейнічаў і трымаў сувязь з пяццю партызанскімі атрадамі, якія дагэтуль дзейнічалі ізалявана. Між імі была дамоўленасць, які атрад, у якім напрамку павінен весці разведку, трымаць абарону. Яскравым прыкладам баявога ўзаемадзеяння атрадаў з`яўляецца санны рэйд у сакавіку 1942 г., аб якім ішла гаворка вышэй. Але Васіль Захаравіч добра разумеў, што для каардынацыі дзеянняў партызанскіх падраздзяленняў, асабліва пры сумесных баявых аперацыях, «требовалось какое-то общее руководство, поскольку отряды были связаны между собой» [3, с. 11]. І толькі летам 1942 г., пасля таго, як быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху, была наладжана сувязь з Цэнтрам. Праўда, яна была яшчэ не рэгулярная, аднак з`яўлялася вялікай справай. Усведамленне таго, што аб іх ведаюць, аб іх думаюць там, у Цэнтры, было вялікай маральнай падтрымкай для партызан.

Да пачатку лістапада 1942 г. на тэрыторыі Пінскай вобласці было створана 7 партызанскіх атрадаў, у якіх налічвалася да 2 000 партызан [5, с. 362]. На базе гэтых атрадаў было створана Пінскае партызанскае злучэнне пад кіраўніцтвам легендарнага камандзіра і арганізатара В. З. Каржа. У яго шэрагах у 1944 г. знаходзілася ўжо 15 000 байцоў [2, с.177].

Такім чынам, у інтарэсах даследавання гісторыі партызанскага руху асаблівую цікавасць выклікаюць дакументы асабістага архіва В.З. Каржа. Багаты інфармацыйны іх змест дапаўняе здабыткі айчыннай гістарыяграфіі, дапамагае з большай аб`ектыўнасцю ствараць цэласную карціну гістарычных падзей

станаўлення і развіцця партызанскага руху на Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Арыгінальнасць гэтай крыніцы заключаецца ў тым, што ў ёй занатоўваюцца некаторыя ключавыя моманты, якія на цяперашні час замоўчваюцца ў айчыннай гістарыяграфіі. Гэта адносіцца да такіх пытанняў, як знішчэнне рэзерву партызанскіх кадраў у сярэдзіне 30-х гадоў, бяздзейнасць асобных партыйных кіраўнікоў, якія былі пакінуты для арганізацыі партызанскай барацьбы, рэпрэсіі 30-х гадоў, што адштурхоўвалі народ ад савецкай улады, не заахвочвалі яго ў разгортванні «ўсенароднай барацьбы» ў абарону гэтай улады. Несумненна, гэтыя дакументы патрабуюць далейшага асэнсавання, аднак факты, якія вынікаюць з іх, пераконваюць у неабходнасці іх выкарыстання пры разглядзе гісторыі партызанскага руху на Беларусі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

## ЛІТАРАТУРА


1. Гомельщина партизанская. Начало. Июнь 1941 – май 1942 г.: сб. док. и материалов // НАРБ. – Минск, 2010. – Вып. 1. – 238 с.

2. *Корж, В. З.* Моя борьба и труд / В. З. Корж // Неман. – 1998. – № 2. – С. 177–228.

3. Докладная записка «О проделанной работе в тылу врага за период с первых дней войны, т.е. с июня 1941 года по 3-е апреля 1942 года» // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994. – № 2. – С. 15–19; № 4. – С. 7–16.

4. *Нордман, Э. Б.* Не стреляйте в партизан… / Э. Б. Нордман. – Минск : Беларусь, 2007. – 200 с.

5. *Смирнов, Н. И.* Генерал Корж. Неизвестные страницы… / Н. И. Смирнов. – Минск : Звязда, 2014. – 686 с.